# ПАТРЫЯТЫЗМ - ГАЛОЎНЫ СТОЎП НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaj Historyi
Fond 9/164/1(30)

З таго часу/26 студзеня 1990 года/ як быў прыняты закон"Аб мовах у Беларускай ССР",на сваей дзяржаўнай працы я карыстаюся нашай дзяржаўнай - роднай беларускай мовай,ды яшчэ у такой галіне як медыцына, гдзе маса іншамоўнай інфармацыі: афармляю усю афіцыйную дакументацыю, пішу артыкулы,размаўляю з супрацоўнікамі,калегамі,праважу канферэнцыі і г.д. А да гэтага часу 5 гадаў я вучыўся на польскай мове,будучы беларусам,толька 3 гады-на сваей роднай беларускай мове і 45 гадоў сам вучыўся і прападаваў на рускай мове,у тым ліку 35 гадоў у Мінскім медыцынскім інстытуце.Перайці на карыстанне дзяржаўнай мовай для мяне не было ніякай асаблівай праблемы.Ніякага псіхалагічнага бар'ера мне пераадолівацъ ня трэба было,бо я беларус перахадзіў у сваім уласным доме на сваю дзяржаўную беларускую мову.Праўда,гэта адбылося пазнавата,бо мне пайшоў тады 63 год.

Я зыходзіў з прынцыпа,што у усялякай справе трэба меньш гаварыць а больш рабіць.А у такой лёсаноснай справе для беларускага народа,як дзяржаўнасць мовы - марудзіць ня трэба.

Мяне адразу усе добра разумелі,але былі і кпіны,і злосць,і здзекі на да мной і мовай.Адны патрабавалі каб я карыстаўся рускай,другія каб з імі размаўляў па-польску,трэціі - каб пісаў па-латыні,хаця усе яны добра разумелі па-беларуску.Яны проста псіхалагічна не хацелі змірыцца,што беларус,наканец,загаварыў па-свойму.Некаторыя хіхікалі у тэлефонную трубку.Мая начальніца хлопала са злосці дзьвярамі,нават намікнула мне,што гэта ад таго,што я пабываў у псіхушцы.Але я не адступіў і усё гэта тактычна перадалеў.

Як вядома,і на нашу мову,і культуру,і дзяржаўнасць,і войска і на усё беларускае часта накідываюцца рознага рода "інтэрнацыяналісты",жадаючыя распараджацца у чужым доме. А нядаўна/16.XII.1992г./ у "Саветской Белорусии" з'явіўся артыкул - аткрыты ліст Вярхоўнаму Савету Рэспублікі Беларусь: "Семь раз отмерьте"...акадэмікаў Расійскай акадэміі навук В.Копцюга, А.Трафімука і чл.кар.той жа акадэміі

vytoki.net

навук - беларусаў па паходжанню. Вот што шаноўныя акадэмікі пішуць:" Поверьте, добровольное принятие единого для огромной страны русского языка в науке и технике было благом для всех союзных республик, а не великодержавной прихотью России". Аб "добровольном принятии русского языка" мы ужо многа разоў чулі, колькі можна кўвадушнічаць? Складываецца ўражанне, што нашы землякі-акадэмікі зусім не знаемы з гісторыяй сваей былой бацькаўшчыны. Акадэмікі сцвярджаюць, што без дзяржаўнасці рускай мовы у Рэспубліцы Беларусь рухніць уся наша навука. А я вось упэўнен, што беларуская мова прыгодна для любых навук. А як абыходзяцца сваей мовай вучоныя іншых краін, напрыклад, Фінляндыі, Швэцыі, Швейцарыі, Даніі і г.д. гдзе няма ні англійскай, ні рускай дзяржаўнай мовы ?! А навука там на вельмі высокім узроўні. Вучоны, проста, павінен знаць розныя мовы, асабліва англійскую, а беларусу авалодаць рускай мовай зусім не трудна. Калі вынікі навукі каштоўныя, іх сразу, з любой мовы, падхваціць і перавядуць на сваю мову. Так што, нам беларусам, жывучым тут на сваей адвечнай Радзіме не патрэбна, каб руская мова была у нас другой дзяржаўнай мовай дзеля "спасення" беларускай навукі.

Нам, беларусам, незалежнасць нялегка дасталася: за яе лепшыя сыны сваей бацькаўшчыны змагаліся як маглі. Мне таксама набалела за лес свайго беларускага народа, сваю Бацькаўшчыну, нікчэмную палітыку КПСС, якая, як я упэўнен быў, вяла к краху. Усё набалеўшае я выкладаў ЦК КПСС, КПБ у 1979-82 гадах у пісьмах і асабліва у "Сустрэчных закліках к ЦК КПСС". Усяго іх было 99 - стольке, скольке і заклікаў ЦК КПСС к савецкаму народу. Вот большая частка маіх сустрэчных заклікаў: 1. Далоў афганскую аванцюру, а вінаватых за яе пад суд! 2. Кастрычніцкая рэвалюцыя нарадзіла новыя формы эксплуатацыі чалавека чалавекам! 3. Камунізм, як і вечны рухавік, пабудаваць немагчыма! 4. Няхай намі не кіруе састарэлая камуністычная хунта! 5. Няхай выбары у Саветы будуць дэмакратычнымі! 6. Наша "свабода слова" - хваліць КПСС і урад нават тады, калі яны гэтага не заслугоўваюць. 7. Далоў цэнзуру! 8. Няхай будуць свабодны выезд із СССР і уезд у яго! 9. Далоў марыянетачныя прафсаюзы! 10. Сумлен-

vytoki.net

наму чалавеку жыць цяжка! 11.Хто не згодзен з палітыкай КПСС – той "шызафрэнік"! 12.Дагонім у тэхнічных адносінах Японію! 13.Далоў паказуху,ураўнілаўку,прыпіскі,прывілеі,незаслужаныя узнагароды,прэміі і званні! 14.На дэманстрацыю па загаду сумлення і сэрца,а не па спіску і прымусу! 15.Камуністычным рэжымам паралізованы эканоміка і дзелавая актыўнасць! 16.Дадзім дзецям малако ад наменклатурных кароў! 17.Няхай у Беларусі не закрываюцца беларускія школы! 18.Няхай у спецыяльных навучальных установах навучанне вядзецца на роднай беларускай мове! 19.Няхай жыве салідарнасць паміж беларусамі свету! 20.Няхай жыве запраўдны сацыялізм! 21. Расейскі,Кітайскі і Кампучыйскі камуністычны тэрор адпугнуў народы ад сацыялізма! 22.Мы беларусы з брацкаю Руссю разам шукалі к шчасцю дарог...і не знайшлі! 23.Расея ~~за 20 з лішнім гадоў~~ прычыніла беларусам больш гора і няшчасця,чым ~~за такі прамежутак часу~~ татары прычынілі Расеі! 24.Расея і бальшавікі атнялі у беларусаў і раздалі сваім хаўруснікам адну трэць беларускай этнічнай тэрыторыі! 25.Няхай Расея верне нам усё награбленае у беларусаў! 26.Саюз нерушымы рэспублік свабодных сплаціла навекі вялікая Русь ... бальшавіцкімі штыкамі! 27.За загубу мільёнаў ні у чым не віноўных суайчыннікаў,камуністаў-фашыстаў трэба судзіць,як і нямецкіх фашыстаў не залежна ад часу зроблена злачынства! 29.Краіну давялі да таго,што зямлю скора некаму будзе даваць і пахаць! 30.Сколька можна пахаць соткі саматужна і за самагонку!? 31.Без прыватнай уласнасці на зямлю "передовое социалистическое сельское хозяйство" ніколі не падняць! 32.Запушчаннасць расейскага нечарназем'я – вынік адсутнасці прыватнай уласнасці на зямлю! 33."Харчовая праграма" 1981 года правалілася як і папярэднія! 34. Не важна з тым – у каго купляеш хлеб! 35.Няхай узноў напоўняцца галасамі дзецей і моладзі нашы вёскі!. 36. У нас разгортываюцца польскія падзеі канца 70-х і пачатку 80-х гадоў! 37.Сталін – тэрарыст, Хрушчоў – распуцін,Брэжняў – дэмагог! 38.Спыніць каланізацыю і засілле "рэспублік свабодных" бо гэта прывядзе не к утварэнню "единой советской нацыи",а к міжнацыянальным канфліктам! 39.Палітыка КПСС неэфектыўная і вядзе "Союз нерушимый" к краху! 40.Аўтарытэт КПСС падае. 41.КПСС

vytoki.net

кішць кар'ерыстамі,прайдзісветамі,жулікамі,уладкаваўшыміся ў партыю по-блату! 42 Што галава - то партыя!кожны думае па-свойму! 43.Братэрскае прывітанне вялікаму польскаму народу мужна змагаючамуся за гонар, свабоду і незалежнасць сваей краіны! 44.Наша свабода сумлення - прымусовая палітвучоба з якой нікому ніякай карысці,а тольки пустая трата часу! 45.Пры уладзе бальшавікоў чалавек чалавеку тыграм стаў,бо такі жах народ нікалі не перажываў! 46.Камуністычнай мараллю сталі: "блат выше наркома", "закон как дышло"...,кламства,ашуканства,крывадушша, п'янства,разводы да 30-50%%, непавага к людзям,замена чалавечых форм звароба біялагічнымі:"жанчына","мужчына"! 47.Няхай жыве крытыка кіраўнікоў КПСС з нізу у верх,а не надварод! 48.Краіны сацыялістычнай арыентацыі,арыентуйцеся на свае магчымасці,а не на нашу дарэмную дапамогу 49.Адновім нашы гістарычныя помнікі і святыні,чалавечую мараль,годнасць сумленнасць! 50.Навучым моладзь шчыра працаваць! 51.Няхай на дэманстрацыях кіраўнікі партыі і урада ідуць уталаве калон,а не хаваюцца за гранітнымі тумбамі-трыбунамі! 52.Няхай члонкі КПСС і урада аб'ядна-юцца ў каператыў і самі сабе пабудуюць дачы за уласны кошт! 53. Капіталісты - "дурні",а камуністы - "разумныя". 54.Далоў смяротную кару! 55.Няхай жывуць гуманізм і міласэрнасць! 56.Няхай будзе магчымасць на будаваць дом які хочаш і набыць зямлю там,гдзе яна табе спадабалася! 57.Мы наш,мы новы дом збудуем,а потым стары зруйнуем! 58.Добраму гаспадару пагода не памеха,а дрэннаму заўседы мешаіць! 59.У краіне,гдзе мядамі пахлі грэчкі;цяпер грэчкі не знойдзеш у магазінах і са свечкай 60.Далоў безгаспадарнасць! 61.Спасем прыроду ад экалагічнай небяспекі 62.Далоў дармавое медыцынскае абслуговыванне за кошт амаль дармавой працы медыцынскіх работнікаў! 63.Бедны урач для хворага небяспечней хваробы!64.Медыцынкія работнікі,памрыце,але хабар у хворага не бярыце 65.Няхай жыве самая перадавая і самая бедная у свеце савецкая інтэлігенцыя! 66.Няхай закончыўшыя вышэйшую навучальную установу муж і жонка без дапамогі бацькоў прагадуюць сябе і адно дзіця!67.Сардэчнае прывітанне гаратным савецкім жанчынам,на плячах каторых сям'я,служба,план, а часта і п'яны Іван! 68.Няхай не будзе цяжкіх і малааплачываемых

vytoki.net

"жаночых" прафесій ! 69.Савецкія жанчыны,не верце хлусні аб раўнапраўі з мужчынамі,самі барыцеся за свае правы і лёс! 70.Далоў дэпапуляцыю!71.Няхай будзе магчымасць займець кватэру ці дом у маладосці! і г.д

Усе мае дысідэнтскія матэрыялы аказаліся ў Мінскім абласным КДБ,куды забралі і аўтара,гдзе мяне абвінавацілі ў "клевете на Советский Союз".Пад дыктоўку мяне заставілі пакаіцца,што больш "клеветать" не буду і ў гэтым узялі распіску.А потым я "дабравольна" пабыў 1,5 месяца ў псіхушцы,выкінуўшы усе,што там мне назначалі,"дабравольна"аставіў пасаду загадчыка кафедрай у Мінскім медыцынскім інстытуце,гдзе я вучыўся і адпрацаваў 36 гадоў і прайшоў шлях ад студэнта да прафесара "дабравольна" цяжка пацярпела уся мая сям'я.Рэпрэсіўны апарат КПСС так працаваў,каб усё выглядзела "дабравольна","абаснавана"і"законна".Толька выхад із партыі "дабравольна" не афармлялі,а "выключалі" і мяне выключылі "за клевету на Советский Союз",хаця заяву аб выхадзе із КПСС я падаў, будучы ў псіхушцы ў красавіку 1983 года,з просьбай выключыць як "сумашэдшага".

У псіхушках пабывалі апаснейшыя для КПСС дысідэнты.Наогул, прымяненне псіхіятрыі ў палітычных і карных мэтах з часоў Брэжнева стала ў Савецкім Саюзе даволі распаўсюджанай з'явай,што вызвала пратэст у вусім свеце. 29 чэрвеня 1990 года Пастановай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР была выбрана Часовая камісія ВС БССР па расследаванню фактаў выкарыстання псіхіятрыі ў палітычных і рэпрэсіўных мэтах із 12 чалавек пад старшынствам народнага дэпутата РБ Заблоцкага У.М. Гэтай самай высокай камісіі паступіла ад грамадзян РБ больш за 150 скарг.Людзі прасілі спасці іх душы.Але тут здарылася неверагоднае: усе гэтыя матэрыялы із памяшкання Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь зніклі.Напэўна камусьці гэта было выгадна...

Амаль дзесяць гадоў я ужо працую ў другім месцы.За гэты час распаўся Саюз,Беларусь стала суверэннай дзяржавай,у якой,нажаль,так мала зроблена для адраджэння беларускай нацыі,хаця зрухі ёсць.Ужо і са мной некаторыя гавораць па-беларуску.К маей мове людзі ужо прывыклі, зніклі кпіны і хіхіканні,здзеклівыя рэплікі.Але скалечаныя за дзесяці-

vytoki.net

годдзі псеўдаінтэрнацыяналізмам нацыянальныя беларускія моладзь,інтэлігенцыя,вучоныя і невучоныя у большасці сваей ніяк не могуць набрацца храбрасці каб загаварыць на сваей дзяржаўнай роднай беларускай мове. Лічу,што галоўны столб нашай беларускай дзяржаунасці і нашага суверініта - гэта нацыянальны патрыятызм і у гэтых адносінах мы беларусы павінны браць прыклад у нашых бліжэйшых і дальніх суседзяў.

Адаслана ў ЛіМ
4.I.93г.

Адаслана ў
ЛіМ 4.I.93г.